# Размова аб кнігах

## ВЕРНЫЯ СЫНЫ РАДЗІМЫ

9 мая ўвойдзе ў гісторыю нашай Радзімы як светлы дзень вялікай перамогі савецкага народа над цёмнымі сіламі фашызму.

У цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны савецкія людзі, нашы слаўныя воіны і партызаны яшчэ глыбей праніклісяя любоўю да Радзімы, адказнасцю за яе лёс. Па першаму закліку роднай Камуністычнай партыі ўвесь народ падняўся на свяшчэнную вызваленчую вайну. На беларускай зямлі грозна і бязлітасна, днём і ноччу «дубіна народнай вайны» знішчала ненавісных фашысцкіх захопнікаў.

Аб слаўных справах беларускіх партызан, аб іх гераізме і бяссмяротных подзвігах, аб зараджэнні і развіцці партызанскага руху на Віцебшчыне расказваецца ў кнізе Героя Савецкага Саюза В. Я. Лабанка «Партызаны Віцебшчыны ў баях за Радзіму» (Дзяржвыдавецтва БССР, 1959).

У даходлівай форме аўтар апавядае аб бяспрыкладнай мужнасці і здзіўляючай знаходлівасці, якія праяўлялі нашы людзі ў жорсткіх схватках з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У гэтай цікавай кнізе раскрываецца ўсенародны характар партызанскай барацьбы ў Беларусі і ў прыватнасці на Віцебшчыне, паказваецца арганізуючая роля партыі ў развіцці партызанскага руху. В. Я. Лабанок паказвае, што партыйнае кіраўніцтва было адным з рашаючых фактараў, які вызначаў рост баявой арганізацыі, згуртаванасці і актыўнасці партызанскіх сіл.

Аб тым, як зараджаўся і развіваўся партызанскі рух на Віцебшчыне, як ён ператварыўся ў сапраўдны пажар усенароднай партызанскай барацьбы расказваецца ў раздзелах «Цяжкія выпрабаванні», «Суровая зіма», «Полымя ўсенароднай барацьбы разгараецца». Значнае месца ў кнізе Лабанка адведзена паказу таго, як з маленькага баявога атрада ў Суражскім раёне нарадзілася славутая Першая Беларуская партызанская брыгада, якой камандаваў Герой Савецкага Саюза М. Ф. Шмыроў.

Маральная прыгажосць вобраза Міная Філіпавіча Шмырова — у яго бязмежнай адданасці справе партыі, народу. Ён прышоў у Камуністычную партыю, ясна разумеючы, што быць яе членам — значыць ісці насустрач найбольшым цяжкасцям. У гэтага камуніста было столькі ўпартасці, веры і знаходлівасці, што ніякая сіла не змагла зламаць яго.

Аўтар апісвае адну з першых схваток атрада Шмырова з ворагам. Баі ішлі ў раёне Смаленска, пад Вялікімі Лукамі. Вырашыўшы, што іх ніхто не патрывожыць, гітлераўцы размясціліся на правым беразе ракі Тураўкі. Але з прыбярэжнага хмызняку партызаны адкрылі агонь. Сам Шмыроў лёг за кулямёт. Было забіта 30 варожых салдат.

Першы поспех акрыліў народных мсціўцаў. Атрад «Бацькі Мінаяя» стаў бязлітасна помсціць гітлераўцам за кроў і пакуты савецкіх людзей. Аб буйной аперацыі атрада Шмырова паведамляла Савінформбюро 3-га верасня 1941 г. Партызанскі атрад напаў на фашысцкі гарнізон у Суражы, разграміў яго канцылярыю, захапіў усю перапіску, 10 аўтамашын, 20 матацыклаў, 12 кулямётаў, каля 50 аўтаматаў і шмат боепрыпасаў. Партызаны закідалі гранатамі хаты, у якіх размяшчаліся фашысты.

На канкрэтных і яркіх фактах у кнізе паказваецца, як расла і загартоўвалася дружная партызанская сям'я «Бацькі Мінаяя». Цяжкай была зіма 1941—42 года. Пераходы па глыбокім снезе, варожыя засады, 30-градусныя марозы, недахват прадуктаў — усё гэта выматвала сілы. Але народныя мсціўцы стойка пераносілі нягоды, храбра змагаліся з акупантамі. Партызаны вызвалілі ад гітлераўцаў тэрыторыю 15 сельскіх Саветаў Суражскага і Мехаўскага раёнаў, знішчылі многа гітлераўскіх салдат і афіцэраў, баявой тэхнікі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы